# Дарогі, вечныя дарогі !



**Па гарызанталі: 1.** Дарожны рабочы, які пракладвае дарогу брукам. **5.** Дрэва, якое некалі абрамляла большасць беларускіх дарог. **8.** Яма на дарозе ад язды. **9.** «Дарогі, вечныя дарогі ! // Не вечна ж ходзяць па вас ... !». З паэмы Я. Коласа «Новая зямля» (раздзел «Па дарозе ў Вільню»). **11.** «Хуткая ... захоплівае дух, а калі-некалі і жыццё». Г. Аляксандраў. **13.** Цану дарогі ведае конь, цану праўды — ... (прык.). **14.** «Калі дзяўчына ўступае табе ... ў аўтобусе, няма сэнсу да яе заляцацца». А. Давідовіч. **16.** На ўезджанай дарозе ... не расце (прык.). **17.** Час уборкі збожжавых культур. **18.** Тое, на што абапіраецца мост праз раку, пуцеправод. **19.** «І павяла мяне дарога // У новы ..., у новы свет». З верша С. Грахоўскага «Пачатак дарогі». **20.** Напрамак лініі дарогі. **22.** Рэч, якую дорацъ на шчасце. **25.** Буйная лінейная ўпадзіна ў зямной кары. **26.** Веснавы шлях — не дарога, а п'янага мова — не ... (прык.). **27.** «Як я ехаў да яе // ... на рысорах, // А прыехаў ад яе, хе-хе, // Хата на падпорах». З беларускай народнай песні «Як я ехаў да яе».

**Па вертыкалі: 1.** Алгебраічны выраз; двухчлен. **2.** 14-я літара грэчаскага алфавіта. **3.** Той, хто імкнецца атрымаць за сваю работу больш, чым яна каштуе. **4.** Дзе праехала пярэдняе ... воза, там праедзе і задняе (турэцкая прык.). **5.** Ударная частка паравога молата. **6.** Рухомы папярочны брус на мачце судна. **7.** Рамка. **10.** «Бяжыць пад коламі ..., // Бягуць прысадзіны назад». З верша Я. Купалы «На Даўгінаўскім гасцінцы». **12.** Стомлены, змучаны ў дарозе. **15.** ... сябра і вораг чалавека (прык.). **16.** «Храпуць узмыленыя коні, // клубіцца пыл над бальшаком». З верша А. Вялюгіна «Кацярынінскі ...». **19.** Першая нота музычнай гамы. **21.** Восеньская кветка. **22.** Не конь вязе, але дарога, не бог памагае, але ... (прык.). **23.** «А я лягу — прылягу ... гасцінца старога». З песні «А я лягу-прылягу» (словы Н. Гілевіча, музыка Э. Ханка). **24.** Прадстаўнік народа, які насяляе Сярэднюю Азію і Паўночную Афрыку. **25.** Назва літары «р» у старажытнаславянскай азбуцы.

**Склаў Лявон ЦЕЛЕШ.**

*г. Дзяржынск.*

**ПРАВЕРЦЕ, КАЛІ ЛАСКА, АДКАЗЫ:**

**Па гарызанталі:** 1. Брукар. 5. Бяроза. 8. Выбоіна. 9. Ногі. 11. Язда. 13. Чалавек. 14. Месца. 16. Трава. 17. Жніво. 18. Апора. 19. Дзень. 20. Траса. 22. Падкова. 25. Рыфт. 26. Гутарка. 27. Брычка. **Па вертыкалі:** 1. Біном. 2. Ксі. 3. Рвач. 4. Кола. 5. Баёк. 6. Рэя. 7. Асада. 10. Гасцінец. 12. Здарожаны. 15. Агонь. 16. Тракт. 19. До. 21. Астра. 22. Пуга. 23. Край. 24. Араб. 25. Рцы.

## СЁННЯ

### Сонца

| | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 8.03 | 17.43 | 9.40 |
| Віцебск — | 7.56 | 17.29 | 9.33 |
| Магілёў — | 7.53 | 17.33 | 9.40 |
| Гомель — | 7.46 | 17.34 | 9.48 |
| Гродна — | 8.17 | 17.59 | 9.42 |
| Брэст — | 8.14 | 18.03 | 9.49 |

### Месяц

*Апошняя квадра 22.10—29.10.*
*Месяц у сузор'і Шаляў.*

### Імяніны

*Пр. Аляксандра, Дзмітрыя, Івана, Леаніда, Міхаіла, Пятра, Сямёна, Сяргея.*
*К. Антона, Тадэвуша, Шымана, Юды.*



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

## ЗАЎТРА






**Яўгена ПЯСЕЦКАГА фота слова**




*У шчасны час, у час бяды,*
*Ў вясновым лесе, у полі зімнім*
*Я чую ўсюль напеў радзінны...*
*Хіба ж не гэта чуеш ты?*

*Я з песняй сто шляхоў прайшоў,*
*Шмат што знайшоў*
*і зноў шукаю.*
*Яна — свая: ляціць, кружляе*
*У чарадзе маіх гадоў.*

*Усё спакваля ў нябыт сплыве,*
*А гэта песня — не знікае.*
*Той песні сэрца падпявае,*
*Ў ёй мова матчына жыве.*

На адной з мінскіх вуліц днямі вырас новы білборд. Узнёсся ён вышэй за ўсе навакольныя нясьбіты рэкламы і безальтэрнатыўна запатрабаваў ад насельніцтва «падпяваць» растыражыраваным спевакам з нашай суседкі Расіі. Не стану спрачацца, тыя спевакі вядомыя даўно і паўсюдна. Але ж чаму ў цэнтры беларускай сталіцы не знайшлося месца для прозвішчаў беларускіх спевакоў? Мяркую, што не супраць былі б спевакі Расіі і Беларусі, калі б аматары эстрады падпявалі ім разам.

У працяг тэмы хачу прапанаваць чытачам «Звязды» пазнаёміцца з фотаздымкам, на якім наша чытачка Сафія Мароз з Асіповіцкага раёна з унукам Уладзіславам. Спадарыня Сафія даўно піша выдатныя вершы на роднай мове, спявае ў фальклорным ансамблі. У зборніках яе паэзіі таксама сцвярджаецца думка пра тое, што павага да роднай мовы спрыяе еднасці розных народаў.

Даты | Падзеі | Людзі

## 28 КАСТРЫЧНІКА



**1572** год — заснавана Лоская друкарня, адзін з цэнтраў рэфармацыйнага кнігавыдання XVI стагоддзя ў Беларусі. Дзейнічала ў мястэчку Лоск Валожынскага раёна да 1592 года. Належала магнату Яну Кішку, які выкупіў у братоў Кавячынскіх абсталяванне Нясвіжскай друкарні і размясціў яго ў сваім маёнтку. У 1570-х — пачатку 1580-х ідэйным кіраўніком друкарні быў Сымон Будны. У гэтай друкарні выдадзены Новы Запавет у яго ным перакладзе (з прадмовай і заўвагамі). Тут працавалі вядомыя друкары Данііла Ланчыцкі і Ян Карцан. Лоская друкарня працягнула выдавецкія традыцыі Францыска Скарыны. Перастала існаваць пасля смерці Яна Кішкі (1592).

**1886** год — пад гарматную кананаду адбылося ўрачыстае адкрыццё самага знакамітага помніка Амерыкі — статуі Свабоды. Яна была ўстаноўлена ў вусці Гудзона ў нью-ёркскай гавані.

**1897** год — праведзены першы і адзіны ў XIX стагоддзі поўны перапіс насельніцтва Расійскай імперыі. Колькасць жыхароў Расіі (без уліку Фінляндыі) складала 126,4 млн чалавек, з іх 13 працэнтаў — гарадское насельніцтва. У Беларусі (у сучасных межах) — 6,3 млн чалавек.

**1946** год —дзень нараджэння Віктара Клімчука, рэжысёра, заслужанага дзеяча мастацтваў. З 1985 года — рэжысёр Віцебскай лялечнай трупы пры тэатры імя Я. Коласа, з 1990-га — мастацкі кіраўнік створанага на аснове лялечнай трупы беларускага тэатра «Лялька».

### Было сказана

**Ніна МАЦЯШ, паэтэса:**

*«О Божа, дай мне сілы не змяніць*
*Таго, чаго змяніць не ў сіле я.*
*І дай мне мудрасці, каб разлічыць,*
*Што — не пад сілу мне, а што — мой абавязак».*

## УСМІХНЕМСЯ

**«Цяжка ў вучэнні? Лёгка ў баі!» — павітаў ваенкам адлічаных за непаспяховасць студэнтаў.**

Заможны стары дыктуе натарыусу завяшчанне:
— Маёй жонцы, якая ўсё жыццё марыла пра брыльянтавае кальє і норкавае футра, я даю ў спадчыну сваё старое крэсла-качалку — у ім добра марыць...

**Пайшла на кухню выключыць святло. Вярнулася з дзвюма катлетамі...**
**Пiць хачу — баюся вяртацца...**

— Вова, як думаеш, каму жыць цяжэй — мужыкам ці жанчынам?
— Ганначка, вядома ж мужыкам!
— Гэта яшчэ чаму?
— Дык з-за жанчын!




Малюнак Аляксандра КАРШАКЕВІЧА.

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.
РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: Н. ДРЫЛА, Н. КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. ЛЯЎКОВІЧ (першы намеснік дырэктара), М. ЛІТВІНАЎ (намеснік галоўнага рэдактара), В. МЯДЗВЕДЗЕВА (намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК (намеснік галоўнага рэдактара).
Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».
НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.
ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 284 44 04, падпіскі і распаўсюджвання — 284 44 04, бухгалтэрыі: 287 18 81.
Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.
http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zviazda.by,
(для зваротаў): zvarot@zviazda.by
ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.
Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004.
220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.
Тыраж 20.023. Індэкс 63850. Зак. № 4175.
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
Нумар падпісаны ў 19.30 27 кастрычніка 2016 года.